Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь
Вучэбна-метадычнае аб’яднанне
па адукацыі ў галіне культуры і мастацтваў

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# БІБЛІЯТЭЧНА-ІНФАРМАЦЫЙНАЕ АБСЛУГОЎВАННЕ
## Раздзел 2. АБСЛУГОЎВАННЕ КАРЫСТАЛЬНІКАЎ БІБЛІЯТЭК

*Тыпавая вучэбная праграма*
*па вучэбнай дысцыпліне для спецыяльнасці*
*1-23 01 11 Бібліятэчна-інфармацыйная дзейнасць*
*(па напрамках)*

Мінск 2017

**СКЛАДАЛЬНІК**
*Н. У. Клімянкова,* прафесар кафедры менеджменту інфармацыйна-дакументнай сферы ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў», кандыдат педагагічных навук, дацэнт

**РЭЦЭНЗЕНТЫ:**
*вучоны* савет дзяржаўнай установы «Цэнтральная навуковая бібліятэка імя Якуба Коласа Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі»;
*Ю. А. Пераверзева,* загадчык аддзела камплектавання фондаў дзяржаўнай установы «Нацыянальная бібліятэка Беларусі», кандыдат педагагічных навук, дацэнт

**РЭКАМЕНДАВАНА ДА ЗАЦВЯРДЖЭННЯ Ў ЯКАСЦІ ТЫПАВОЙ:**
*кафедрай* менеджменту інфармацыйна-дакументнай сферы ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў» (пратакол № 10 ад 23.05.2016 г.);
*прэзідыумам* навукова-метадычнага савета ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў» (пратакол № 1 ад 19.10.2016 г.);
*навукова-метадычным* саветам па культуры, бібліятэказнаўстве і бібліяграфіі вучэбна-метадычнага аб'яднання па адукацыі ў галіне культуры і мастацтваў (пратакол № 1 ад 21.10.2016 г.)

Адказны за рэдакцыю: В. Б. Кудласевіч
Адказны за выпуск: Н. У. Клімянкова

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# ТЛУМАЧАЛЬНАЯ ЗАПІСКА

Тыпавая вучэбная праграма па вучэбнай дысцыпліне «Бібліятэчна-інфармацыйнае абслугоўванне» распрацавана для ўстаноў вышэйшай адукацыі Рэспублікі Беларусь у адпаведнасці з патрабаваннямі адукацыйнага стандарту вышэйшай адукацыі I ступені па спецыяльнасці 1-23 01 11 Бібліятэчна-інфармацыйная дзейнасць (па напрамках).

Вучэбная дысцыпліна «Бібліятэчна-інфармацыйнае абслугоўванне» складаецца з двух раздзелаў: «Арганізацыя і тэхналогія бібліяграфічнай работы» і «Абслугоўванне карыстальнікаў бібліятэк». Дадзеная праграма прызначана для вывучэння другога раздзела «Абслугоўванне карыстальнікаў бібліятэк».

*Мэта* вучэбнай дысцыпліны – вывучэнне студэнтамі пытанняў сутнасці бібліятэчнага абслугоўвання ва ўмовах інфарматызаванага грамадства; засваенне метадаў вывучэння, задавальнення і фарміравання чытацкіх запытаў і чытацкіх інтарэсаў; арганізацыі і тэхналогіі абслугоўвання карыстальнікаў бібліятэк.

Мэтавая накіраванасць вучэбнай дысцыпліны абумоўлівае кола *задач*:

– разгледзець тэарэтычныя асновы канцэпцыі і прынцыпы бібліятэчнага абслугоўвання і прыярытэтныя яго кірункі;

– вызначыць асноўныя гістарычныя перыяды вывучэння, задавальнення і фарміравання чытацкага запыту і чытацкіх інтарэсаў;

– раскрыць арганізацыю і тэхналогію бібліятэчнага абслугоўвання карыстальнікаў як у традыцыйным, так і ў аўтаматызаваным рэжымах.

У выніку вывучэння вучэбнай дысцыпліны студэнт *павінен ведаць:*

– тэарэтыка-метадычныя асновы бібліятэчна-інфармацыйнага абслугоўвання карыстальнікаў: задачы, прынцыпы, канцэпцыі, кірункі;

– асаблівасці арганізацыйна-функцыянальнай структуры сістэмы абслугоўвання карыстальнікаў бібліятэк розных тыпаў;

– рэсурсы і тэхналогію абслугоўвання карыстальнікаў бібліятэк;

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

– псіхолага-педагагічныя асновы бібліятэчна-інфармацыйнага абслугоўвання розных катэгорый карыстальнікаў;

*умець:*

– ажыццяўляць вывучэнне карыстальнікаў бібліятэк;

– наладжваць і падтрымліваць псіхалагічны кантакт з карыстальнікам у працэсе групавога, франтальнага і індывідуальнага абслугоўвання;

– ажыццяўляць рэкламу бібліятэкі і сувязь з грамадскасцю;

– вывучаць эфектыўнасць абслугоўвання карыстальнікаў бібліятэк;

*валодаць:*

– навыкамі вывучэння і задавальнення патрэбнасцей карыстальнікаў у інфармацыі і паслугах;

– сучаснымі формамі, метадамі, аўтаматызаванымі і традыцыйнымі тэхналогіямі бібліятэчна-інфармацыйнага абслугоўвання розных катэгорый карыстальнікаў.

Засваенне тыпавой вучэбнай праграмы «Бібліятэчна-інфармацыйнае абслугоўванне. Раздзел 2. Абслугоўванне карыстальнікаў бібліятэк» для спецыяльнасці 1-23 01 11 Бібліятэчна-інфармацыйная дзейнасць (па напрамках) павінна забяспечыць фарміраванне наступных кампетэнцый.

**Акадэмічныя кампетэнцыі:**

АК-1. Умець выкарыстоўваць базавыя навукова-тэарэтычныя веды для вырашэння тэарэтычных і практычных задач; АК-4. Умець працаваць самастойна; АК-8. Валодаць навыкамі вуснай і пісьмовай камунікацыі.

**Сацыяльна-асобасныя кампетэнцыі:**

САК-2. Быць здольным да сацыяльнага ўзаемадзеяння; САК-3. Валодаць здольнасцю да міжасобасных камунікацый; САК-6. Умець працаваць у камандзе; САК-7. Быць здольным асэнсавана ўспрымаць і беражліва адносіцца да гістарычнай, культурнай спадчыны Беларусі і свету, культурных традыцый і рэлігійных поглядаў.

**Прафесійныя кампетэнцыі:**

ПК-5. Весці бібліятэчнае абслугоўванне розных груп карыстальнікаў; ПК-6. Ажыццяўляць традыцыйную і электронную выдачу і дастаўку дакументаў; ПК-7. Фарміраваць інфармацыйную

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

культуру карыстальнікаў; ПК-8. Устанаўліваць і падтрымліваць трывалыя сувязі з рознымі сацыяльнымі інстытутамі (сям’я, школа, установы культуры, адукацыі, прадпрыемствы і інш.) з мэтай фарміравання спрыяльнага сацыякультурнага асяроддзя; развіваць сацыяльнае партнёрства з мясцовымі ўладамі і грамадскасцю; ПК-9. Арганізоўваць і праводзіць інфармацыйна-асветніцкія, адукацыйныя, культурна-творчыя, культурна-дасугавыя і рэкрэацыйна-аздараўленчыя мерапрыемствы; ПК-10. Фарміраваць безбар’ернае бібліятэчнае асяроддзе для абслугоўвання асоб з абмежаванымі фізічнымі магчымасцямі; ПК-11. Выкарыстоўваць псіхолага-педагагічныя метады падчас бібліятэчнага абслугоўвання і правядзення разнастайных сацыяльна-культурных мерапрыемстваў.

Вучэбная дысцыпліна «Бібліятэчна-інфармацыйнае абслугоўванне. Раздзел 2. Абслугоўванне карыстальнікаў бібліятэк» базіруецца на ведах, атрыманых студэнтамі падчас вывучэння вучэбных дысцыплін: «Бібліятэказнаўства», «Тэорыя інфармацыі і дакументалогія. Раздзел 3. Дакументалогія» і звязана з цыклам агульнанавуковых і агульнапрафесійных дысцыплін: «Культуралогія», «Педагогіка», «Псіхалогія». У сваю чаргу веды, уменні, атрыманыя пры вывучэнні вучэбнай дысцыпліны «Бібліятэчна-інфармацыйнае абслугоўванне. Раздзел 2. Абслугоўванне карыстальнікаў бібліятэк», з’яўляюцца асновай для засваення іншых спецыяльных дысцыплін: «Інфармацыйныя рэсурсы», «Бібліятэчна-інфармацыйны менеджмент і маркетынг», дысцыплін спецыялізацый, звязаных з падрыхтоўкай бібліятэчных прадуктаў і паслуг і задавальненнем патрэбнасцей карыстальнікаў у інфармацыі.

У ліку эфектыўных педагагічных методык і тэхналогій, якія садзейнічаюць удзелу студэнтаў у пошуку і кіраванні ведамі, набыццю вопыту самастойнага вырашэння разнастайных задач, вылучаюцца: тэхналогіі праблемна-модульнага навучання; тэхналогія вучэбна-даследчай дзейнасці; камунікатыўныя тэхналогіі; метад аналізу вытворчых сітуацый; гульнявыя тэхналогіі. Студэнты ўдзельнічаюць у дзелавых, ролевых, імітацыйных гульнях.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Для кіравання вучэбным працэсам і арганізацыі кантрольна-ацэначнай дзейнасці выкладчыкам рэкамендуецца выкарыстоўваць рэйтынгавую сістэму ацэнкі вучэбна-пазнавальнай і даследчай дзейнасці студэнтаў, мадэлі кіруемай самастойнай работы, вучэбна-метадычныя комплексы.

У адпаведнасці з тыпавым вучэбным планам і адукацыйным стандартам на вывучэнне вучэбнай дысцыпліны «Бібліятэчна-інфармацыйнае абслугоўванне» ўсяго прадугледжана 380 гадзін, з якіх 210 гадзін – аўдыторныя заняткі. На вывучэнне вучэбнай дысцыпліны «Бібліятэчна-інфармацыйнае абслугоўванне. Раздзел 2. Абслугоўванне карыстальнікаў бібліятэк» усяго прадугледжана 222 гадзіны, з іх 120 гадзін – аўдыторныя заняткі. Прыкладнае размеркаванне аўдыторных гадзін па відах заняткаў: лекцыі – 48 гадзін, семінарскія заняткі – 10 гадзін, лабараторныя заняткі – 24 гадзіны, практычныя заняткі – 38 гадзін. Рэкамендаваныя формы кантролю – залік і экзамен.

Паспяховаму засваенню вучэбнай дысцыпліны спрыяе ўключэнне заданняў у праграму вытворчай практыкі. Атрыманыя ў працэсе вывучэння вучэбнай дысцыпліны веды і ўменні з’яўляюцца базавымі і падлягаюць кантролю на дзяржаўным экзамене.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# ПРЫКЛАДНЫ ТЭМАТЫЧНЫ ПЛАН

| Раздзелы і тэмы | Колькасць гадзін | | | | |
|---|---|---|---|---|---|
| | усяго | лекцыі | семінарскія заняткі | практычныя заняткі | лабараторныя заняткі |
| Уводзіны | 1 | 1 | | | |
| **Раздзел 1. Тэарэтыка-метадалагічныя і нарматыўна-прававыя асновы абслугоўвання карыстальнікаў бібліятэк** | | | | | |
| *Тэма 1.* Эвалюцыя ўяўленняў аб сутнасці, сацыяльнай ролі, мэтах і задачах абслугоўвання карыстальнікаў бібліятэк | 2 | 2 | | | |
| *Тэма 2.* Канцэптуальныя падыходы да абслугоўвання карыстальнікаў бібліятэк | 4 | 2 | 2 | | |
| *Тэма 3.* Абслугоўваннне карыстальнікаў як сацыякультурная, педагагічная і камунікатыўная дзейнасць | 4 | 2 | | 2 | |
| *Тэма 4.* Нарматыўна-прававое забеспячэнне абслугоўвання карыстальнікаў бібліятэк у Рэспубліцы Беларусь | 1 | 1 | | | |
| **Раздзел 2. Вывучэнне карыстальніка бібліятэкі як суб'екта абслугоўвання** | | | | | |
| *Тэма 5.* Вопыт вывучэння карыстальнікаў бібліятэк у Рэспубліцы Беларусь і іншых краінах | 6 | 2 | | 2 | 2 |
| *Тэма 6.* Арганізацыя і методыка вывучэння чытання і чытацкіх паводзін у бібліятэках рознага тыпу | 8 | 2 | | 4 | 2 |
| *Тэма 7.* Уплыў вынікаў даследаванняў на трансфармацыю падыходаў да абслугоўвання карыстальнікаў | 6 | 2 | | 2 | 2 |
| *Тэма 8.* Уплыў вынікаў даследаванняў на прафесійную свядомасць і прафесійныя паводзіны бібліятэкараў | 8 | 2 | 2 | 2 | 2 |
| **Раздзел 3. Сістэма, структура і тэхналогія абслугоўвання карыстальнікаў** | | | | | |
| *Тэма 9.* Сістэма і структура абслугоўвання карыстальнікаў у бібліятэках рознага тыпу | 6 | 4 | | | 2 |
| *Тэма 10.* Рэсурсы і тэхналогія абслугоўвання карыстальнікаў бібліятэк | 4 | 2 | | 2 | - |

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

| | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|
| *Тэма 11.* Бібліятэчна-інфармацыйныя паслугі: асаблівасці і класіфікацыя | 4 | 2 | | 2 | |
| *Тэма 12.* Фарміраванне бібліятэчнага асяроддзя як умовы якаснага абслугоўвання | 3 | 1 | | | 2 |
| *Тэма 13.* Вывучэнне эфектыўнасці тэхналагічных працэсаў абслугоўвання карыстальнікаў бібліятэк | 6 | 2 | 2 | 2 | |
| **Раздзел 4. Прыярытэтныя кірункі, формы і метады абслугоўвання карыстальнікаў** | | | | | |
| *Тэма 14.* Эвалюцыя ўяўленняў аб прыярытэтных кірунках абслугоўвання | 2 | 2 | | | |
| *Тэма 15.* Фарміраванне культуры чытання і інфармацыйнай культуры карыстальнікаў | 4 | 2 | | 2 | |
| *Тэма 16.* Індывідуальнае абслугоўванне карыстальнікаў бібліятэк у сучасных сацыякультурных умовах | 8 | 4 | | 2 | 2 |
| *Тэма 17.* Масавае і групавое абслугоўванне карыстальнікаў бібліятэк | 12 | 4 | | 6 | 2 |
| *Тэма 18.* Віртуальнае абслугоўванне ва ўмовах інфарматызацыі грамадства | 5 | 1 | 2 | | 2 |
| **Раздзел 5. Асаблівасці бібліятэчнага абслугоўвання дзяцей і юнацтва** | | | | | |
| *Тэма 19.* Стан і тэндэнцыі развіцця чытання падрастаючага пакалення як прадмет даследавання ў Рэспубліцы Беларусь | 8 | 2 | | 4 | 2 |
| *Тэма 20.* Псіхолага-педагагічныя ўмовы пазітыўнага ўплыву бібліятэкі на дзіцячае чытанне | 4 | 2 | | 2 | |
| *Тэма 21.* Улік узроставых асаблівасцей юных карыстальнікаў падчас індывідуальнага абслугоўвання | 4 | 2 | | 2 | |
| *Тэма 22.* Трансфармацыя форм масавага абслугоўвання з улікам сацыяльна-псіхалагічных і ўзроставых асаблівасцей юных карыстальнікаў | 6 | 2 | | 2 | 2 |
| *Тэма 23.* Узаемадзеянне бібліятэкі з сям’ёй, школай, сацыяльнымі службамі і грамадскімі арганізацыямі ў працэсе абслугоўвання дзяцей і падлеткаў | 6 | 2 | 2 | | 2 |
| **Разам…** | **120** | **48** | **10** | **38** | **24** |

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# ЗМЕСТ ВУЧЭБНАГА МАТЭРЫЯЛУ

## *Уводзіны*

Вучэбная дысцыпліна «Бібліятэчна-інфармацыйнае абслугоўванне. Раздзел 2. Абслугоўванне карыстальнікаў бібліятэк» як адна з важнейшых вучэбных дысцыплін у працэсе падрыхтоўкі спецыяліста вышэйшай адукацыі. Асноўныя падыходы да выкладання вучэбнай дысцыпліны. Задачы вучэбнай дысцыпліны, яе месца ў сістэме падрыхтоўкі спецыялістаў бібліятэчна-інфармацыйнай сферы. Сувязь вучэбнай дысцыпліны з іншымі вучэбнымі дысцыплінамі. Структура вучэбнай дысцыпліны, яе раздзелы і віды заняткаў. Метадычныя асаблівасці вывучэння вучэбнай дысцыпліны.

## Раздзел 1. Тэарэтыка-метадалагічныя і нарматыўна-прававыя асновы абслугоўвання карыстальнікаў бібліятэк

### *Тэма 1. Эвалюцыя ўяўленняў аб сутнасці, сацыяльнай ролі, мэтах і задачах абслугоўвання карыстальнікаў бібліятэк*

Стан абслугоўвання карыстальнікаў з улікам трансфармацый, якія адбываюцца ў краіне і свеце. Паняцце «абслугоўванне карыстальнікаў» у трактоўцы беларускіх навукоўцаў А. Е. Даўгаполавай, Л. А. Дзямешкі, Л. Г. Кірухінай, Н. У. Клімянковай, С. А. Паўлавай. Паняцце «бібліятэчнае абслугоўванне» ў вызначэннях расійскіх бібліятэказнаўцаў В. А. Азаравай, В. Ф. Барадзіной, А. М. Ванеева, М. Я. Дворкінай, Ю. П. Мяленцьевай.

Разуменне мэты і задач абслугоўвання карыстальнікаў на розных этапах развіцця грамадства. Задачы абслугоўвання карыстальнікаў, вызначаныя ў Законе «Аб бібліятэчнай справе ў Рэспубліцы Беларусь». Вызначэнне задач абслугоўвання ў працах беларускіх навукоўцаў В. М. Бігезы, А. Е. Даўгаполавай, Л. А. Дзямешкі, Л. Г. Кірухінай, С. А. Паўлавай і інш. Задачы абслугоўвання карыстальнікаў у трактоўцы розных аўтараў: В. А. Барадзіной, М. Я. Дворкінай, І. А. Мейжыс, Ю. П. Мяленцьевай і інш. Функцыі абслугоўвання і іх рэалізацыя ва ўмовах бібліятэк рознага тыпу.

РЭПАЗІТОРЫЙ БГУКІ

*Тэма 2. Канцэптуальныя падыходы да абслугоўвання карыстальнікаў бібліятэк*

Абслугоўванне карыстальнікаў як цэласная з’ява, сацыяльны і тэхналагічны працэс. Сутнасць і шляхі развіцця канцэпцый чытання і іх уплыў на характар і змест абслугоўвання карыстальнікаў бібліятэк. Уклад В. Я. Аскаравай, В. А. Барадзіной, М. Я. Дворкінай, Ю. П. Мяленцьевай у распрацоўку канцэптуальных падыходаў да абслугоўвання карыстальнікаў. Сучасныя канцэпцыі бібліятэчнага абслугоўвання і іх рэалізацыя ў бібліятэках рознага тыпу. Трактоўка прынцыпаў абслугоўвання беларускімі (А. Е. Даўгаполава, Л. А. Дзямешка, Р. С. Матульскі, С. А. Паўлава і інш.) і расійскімі (В. А. Барадзіна, М. Я. Дворкіна, Ю. П. Мяленцьева і інш.) аўтарамі. Эвалюцыя ўяўленняў аб прынцыпах абслугоўвання. Дыдактычныя прынцыпы ў абслугоўванні – спецыфіка іх ужывання ў бібліятэцы. Прынцыпы абслугоўвання карыстальнікаў і фундаментальныя законы, сфармуляваныя Ш. Ранганатанам, М. А. Рубакіным, Дж. Шырай і інш.

*Тэма 3. Абслугоўваннне карыстальнікаў як сацыякультурная, педагагічная і камунікатыўная дзейнасць*

Абслугоўванне карыстальнікаў як сацыякультурны працэс. Сацыяльна-педагагічная накіраванасць абслугоўвання. Уплыў інфарматызацыі грамадства і сацыяльна-культурнай інтэграцыі на абслугоўванне карыстальнікаў. Узмацненне педагагічнай функцыі бібліятэкі. Роля бібліятэкі ў забеспячэнні беспeraшкоднага доступу да інфармацыі і культурных каштоўнасцей. Пошукі новых шляхоў у ажыццяўленні абслугоўвання. Камунікатыўная дзейнасць бібліятэкі. Бібліятэка – арганізатар інтэлектуальнага дасуга. Бібліятэка як асяродак інтэлектуальна-творчай дзейнасці карыстальнікаў. Роля бібліятэкі ў працэсе сацыялізацыі асобы карыстальніка. Месца бібліятэкі сярод грамадскіх інстытутаў, якія спрыяюць сацыялізацыі.

*Тэма 4. Нарматыўна-прававое забеспячэнне абслугоўвання карыстальнікаў бібліятэк у Рэспубліцы Беларусь*

Міжнародныя і нацыянальныя крыніцы стварэння нарматыўна-прававой базы абслугоўвання карыстальнікаў. Дакументы між-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

народных арганізацый (ААН, ЮНЕСКА, АБСЕ і інш.), у якіх закладзены агульныя асновы развіцця сусветнага грамадства, у тым ліку і бібліятэк. Дакументы міжнародных арганізацый па развіцці непасрэдна інфармацыйна-бібліятэчнай сферы. Нацыянальныя дакументы, якія вызначаюць асноўныя прыярытэты бібліятэчнага абслугоўвання. Закон «Аб бібліятэчнай справе ў Рэспубліцы Беларусь».

Нарматыўна-прававое рэгуляванне адносін, узнікаючых пры абслугоўванні карыстальнікаў. Забеспячэнне канстытуцыйнага права на пошук і атрыманне інфармацыі. Канфідэнцыяльнасць чытання. Забеспячэнне аўтарскага права пры абслугоўванні карыстальнікаў. Забеспячэнне бібліятэкай якасці прадастаўляемых прадуктаў і паслуг. Адказнасць за парушэнне правілаў карыстання бібліятэкай. Перспектывы развіцця нарматыўна-прававой базы абслугоўвання карыстальнікаў.

## Раздзел 2. Вывучэнне карыстальніка бібліятэкі як суб'екта абслугоўвання

### *Тэма 5. Вопыт вывучэння карыстальнікаў бібліятэк у Рэспубліцы Беларусь і іншых краінах*

Вывучэнне карыстальніка як аснова абслугоўвання і сусветная прафесійная праблема. Вывучэнне карыстальнікаў у Беларусі ў рамках агульнасаюзных даследаванняў. Роля Дзяржаўнай бібліятэкі БССР імя У. І. Леніна ў развіцці сацыялогіі чытання ў Беларусі. Даследаванні пад кіраўніцтвам К. С. Санько: «Роля кнігі і бібліятэкі ў жыцці сучаснай беларускай вёскі» (1978), «Кніга і чытанне ў жыцці рабочых ударных камсамольскіх будоўляў на Беларусі» (1982).

Правядзенне самастойных сацыялагічных даследаванняў у 1990-я гг.: «Чытач масавых публічных бібліятэк» (1990), «Чытач навуковай бібліятэкі і праблемы ўдасканалення яго абслугоўвання» (1993). Даследаванні: «Публічная бібліятэка ў сацыякультурным асяроддзі рэгіёна» (2001), «Інфармацыйныя патрэбнасці насельніцтва аграгарадкоў» (2007), «Інфармацыйныя паводзіны карыстальнікаў бібліятэк Беларусі» (2013). Міжнародныя даследаванні чытання. Беларуска-расійскія даследаванні чытання.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

### *Тэма 6. Арганізацыя і методыка вывучэння чытання і чытацкіх паводзін у бібліятэках рознага тыпу*

Спецыфіка даследавання чытача і чытацкіх паводзін ва ўмовах сучаснай бібліятэкі. Сацыялогія чытання і сацыялогія бібліятэчнай справы: прадмет і задачы. Метадалагічныя прынцыпы вывучэння карыстальнікаў бібліятэк. Праграма сацыялагічнага даследавання чытання як асноўны метадычны дакумент. Метадалагічны і працэдурны раздзелы праграмы. Генеральная і выбарачная сукупнасць, прынцыпы выбаркі і іх ужыванне ў сацыялагічных даследаваннях чытання ў Беларусі. Распрацоўка працэдурнага раздзела праграмы даследавання. Сацыялагічныя, псіхалагічныя і педагагічныя метады ў даследаваннях чытання. Аналіз дакументаў, назіранне і апытанне як асноўныя метады збору першаснай сацыялагічнай інфармацыі аб чытанні і чытацкіх паводзінах. Правядзенне пілатажнага даследавання. Арганізацыя палявога даследавання. Рэкамендацыі па выніках даследавання.

### *Тэма 7. Уплыў вынікаў даследаванняў на трансфармацыю падыходаў да абслугоўвання карыстальнікаў*

Этапы станаўлення методыкі даследавання чытання. Уклад Л. М. Талстога, М. А. Корфа, А. П. Мічурына, В. І. Арлова, А. С. Пругавіна ў вывучэнне чытача-селяніна. Роля Х. Д. Адчэўскай у развіцці методыкі вывучэння чытання жанчын-работніц. Значэнне даследчай дзейнасці М. А. Рубакіна для развіцця тэорыі і практыкі абслугоўвання чытачоў. Выкарыстанне вынікаў даследавання чытача ў культурна-асветніцкай дзейнасці бібліятэкараў канца XIX – пачатку XX ст.

Вывучэнне чытача як дзяржаўная задача пасля Кастрычніцкай рэвалюцыі. Уплыў вынікаў даследаванняў Б. У. Банка, Л. Я. Віленкіна, Н. К. Крупскай, М. А. Смушковай, А. М. Торапава, Л. Н. Трапоўскага, Я. М. Шафіра і інш. у распрацоўку метадычных падыходаў абслугоўвання чытачоў у новых сацыяльна-палітычных умовах. Практыка-арыентаваныя даследаванні чытання і чытацкіх паводзін 1960–1990 гг. Накіраванасць даследаванняў беларускіх сацыёлагаў на вырашэнне задач удасканалення бібліятэчнага абслугоўвання насельніцтва. Уплыў вынікаў дасле-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

даванняў на прыняцце кіраўнічых рашэнняў па арганізацыі бібліятэчнага абслугоўвання ў новых сацыяльна-эканамічных умовах.

*Тэма 8. Уплыў вынікаў даследаванняў на прафесійную свядомасць і прафесійныя паводзіны бібліятэкараў*

Бібліятэкар як непасрэдны ўдзельнік працэсу абслугоўвання карыстальнікаў. Узаемадзеянне бібліятэкара з карыстальнікам як прадмет даследавання. Вынікі даследаванняў С. А. Езавай, Н. У. Клімянковай, І. А. Мейжыс, С. В. Ратманавай аб адносінах чытача да бібліятэкі і бібліятэкара як абгрунтаванне неабходнасці павышэння камунікатыўнай культуры работніка аддзела абслугоўвання.

Прафесійныя і асобасныя патрабаванні да бібліятэкара аддзела абслугоўвання. Фізічныя, інтэлектуальныя, псіхафізічныя, камунікатыўныя і маральныя якасці бібліятэкара і кваліфікацыйныя характарыстыкі супрацоўніка аддзела абслугоўвання. Бібліятэчная прафесіялогія. Погляды А. А. Чачко, А. І. Капцерава, А. В. Сакалова і інш. на сутнасць і змест прафесіі бібліятэкара. Прафесійная свядомасць і этыка бібліятэкара. Фарміраванне новага прафесійнага мыслення бібліятэкара аддзела абслугоўвання. Кодэкс прафесійнай этыкі.

## Раздзел 3. Сістэма, структура і тэхналогія абслугоўвання карыстальнікаў

*Тэма 9. Сістэма і структура абслугоўвання карыстальнікаў у бібліятэках рознага тыпу*

Змястоўны аспект тэрміна «сістэма бібліятэчнага абслугоўвання». Элементы сістэмы. Асноўныя патрабаванні да сістэмы абслугоўвання. Арганізацыйна-функцыянальная структура абслугоўвання. Задачы функцыянальных падраздзяленняў (аддзелаў, сектараў) абслугоўвання абанентаў. Нарматыўныя дакументы, якія рэгулююць дзейнасць аддзела абслугоўвання. Чытальныя залы, індывідуальныя рабочыя месцы для карыстальнікаў, даведачна-інфармацыйны аддзел, абанемент, пазастацыянарнае

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

абслугоўванне. Прадастаўленне доступу да асобных відаў дакументаў: медыятэкі, фанатэкі, відэатэкі. Міжбібліятэчны абанемент, электронная дастаўка дакументаў. Памяшканні для супольнай працы і навучання. Рэкрэацыйныя службы бібліятэкі. Адметныя рысы сістэмы абслугоўвання навуковай бібліятэкі. Арганізацыйна-функцыянальная структура бібліятэкі УВА. Узаемадзеянне функцыянальных падраздзяленняў абслугоўвання і электроннае асяроддзе. Электронныя чытальныя залы.

### *Тэма 10. Рэсурсы і тэхналогія абслугоўвання карыстальнікаў бібліятэк*

Рэсурсы бібліятэчнага абслугоўвання. Іх характарыстыка. Узаемадзеянне і ўзаемаабумоўленасць рэсурсаў абслугоўвання. Выяўленне інфармацыйных патрэбнасцей карыстальнікаў у форме запыту. Чытацкі запыт як элемент бібліятэчнага абслугоўвання. Бібліятэчны запыт і бібліятэчная паслуга. Адмовы і іх папярэджанне. Тэхналогія бібліятэчнага абслугоўвання як сукупнасць прыёмаў і метадаў. Тыпы тэхналогій бібліятэчнага абслугоўвання. Тэхналагічныя аперацыі абслугоўвання і іх элементы. Улікова-тэхнічная дакументацыя абслугоўвання. Улік вынікаў абслугоўвання ў традыцыйнай і электроннай формах. Асаблівасці тэхналагічных працэсаў на аўтаматызаваным рабочым месцы. Мадэль тэхналогіі абслугоўвання.

### *Тэма 11. Бібліятэчна-інфармацыйныя паслугі: асаблівасці і класіфікацыя*

Бібліятэчная паслуга як вынік, асноўны прадукт працэсу бібліятэчнага абслугоўвання. Распрацоўка тэарэтыка-метадычных падыходаў да бібліятэчных паслуг беларускімі навукоўцамі А. Е. Даўгаполавай, Л. А. Дзямешкай, Р. С. Матульскім, С. А. Паўлавай. Уклад у распрацоўку тэорыі бібліятэчнай паслугі расійскіх бібліятэказнаўцаў А. С. Азурханавай, С. А. Басава, М. Я. Дворкінай і інш.

Сутнасныя якасці бібліятэчнай паслугі. Вызначэнне паняццяў «бібліятэчная паслуга», «інфармацыйная паслуга». Распрацоўка класіфікацыі бібліятэчна-інфармацыйных паслуг.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Віды бібліятэчна-інфармацыйных паслуг і іх характарыстыка. Інавацыйны падыход да развіцця бібліятэчна-інфармацыйных паслуг. Інфармацыйна-аналітычныя паслугі. Бібліятэчна-інфармацыйныя паслугі ў электронным асяроддзі.

*Тэма 12. Фарміраванне бібліятэчнага асяроддзя як умовы якаснага абслугоўвання*

Умовы выканання запытаў карыстальнікаў як важная характарыстыка абслугоўвання. Паняцце «бібліятэчнае асяроддзе». Тэарэтычныя канцэпцыі арганізацыі бібліятэчнага асяроддзя ў работах В. А. Азаравай, С. Д. Барадзіной, М. Я. Дворкінай, Г. М. Кармішынай, Г. Б. Паршуковай. Адзінства прадметна-прасторавага і духоўнага кампанентаў бібліятэчнага асяроддзя. Функцыянальныя часткі бібліятэчнага асяроддзя. Зоны абслугоўвання. Камфортнасць бібліятэчнага асяроддзя. Бібліятэчная рэклама як адзін з кампанентаў бібліятэчнага асяроддзя. Узроўні бібліятэчнай рэкламы. Формы бібліятэчнай рэкламы. Рэкламная функцыя мерапрыемстваў бібліятэкі. Рэклама ў сродках масавай інфармацыі.

*Тэма 13. Вывучэнне эфектыўнасці тэхналагічных працэсаў абслугоўвання карыстальнікаў бібліятэк*

Характарыстыка сістэмы ацэнак бібліятэчнага абслугоўвання. Змест тэрміна «эфектыўнасць бібліятэчнага абслугоўвання». Метады вывучэння эфектыўнасці абслугоўвання карыстальнікаў бібліятэк. Сацыяльны, эканамічны, сэрвісны аспекты эфектыўнасці. Якасць як кампанент эфектыўнасці бібліятэчнага абслугоўвання. Крытэрыі і паказчыкі эфектыўнасці дакументных паслуг. Паслугі па задавальненні разавых запытаў. Асноўныя паказчыкі. Дакументныя паслугі апераджальнага характару, іх змест, паказчыкі эфектыўнасці. Крытэрыі і паказчыкі эфектыўнасці камунікатыўных бібліятэчных паслуг. Асноўныя вынікі бібліятэчных мерапрыемстваў. Крытэрыі ацэнкі якасці камунікатыўных паслуг. Змест і характарыстыка сэрвісных паслуг. Крытэрыі эфектыўнасці. Ацэнка сэрвісных бібліятэчных паслуг.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## Раздзел 4. Прыярытэтныя кірункі, формы і метады абслугоўвання карыстальнікаў

### *Тэма 14. Эвалюцыя ўяўленняў аб прыярытэтных кірунках абслугоўвання*

Разуменне кірункаў як перспектыўных мэт абслугоўвання А. Я. Айзенбергам, Г. А. Алтуховай, М. Я. Дворкінай, А. Я. Шапашнікавым. Накіраванасць абслугоўвання карыстальнікаў на вырашэнне актуальных жыццёвых праблем у работах Ю. П. Мяленцьевай. Абслугоўванне карыстальнікаў у дапамогу фарміраванню прававой культуры насельніцтва. Публічныя цэнтры прававой інфармацыі. Бібліятэчнае абслугоўванне ў дапамогу бесперапыннай адукацыі карыстальнікаў. Самаадукацыя як форма бесперапыннай адукацыі. Месца самаадукацыйнага чытання ў сістэме бесперапыннай адукацыі. Абслугоўванне сацыяльна неабароненых карыстальнікаў і карыстальнікаў з псіхічнымі і фізічнымі асаблівасцямі. Нарматыўна-заканадаўчыя дакументы, гарантуючыя забеспячэнне роўных правоў доступу да інфармацыі. Стварэнне безбар’ернага бібліятэчнага асяроддзя. Выкарыстанне сучасных інфармацыйных тэхналогій у абслугоўванні чытачоў з абмежаваннямі па зроку.

### *Тэма 15. Фарміраванне культуры чытання і інфармацыйнай культуры карыстальнікаў*

Вызначэнне паняцця «культура чытання» ў працах В. А. Барадзіной, А. М. Ванеева, Т. Г. Галакціёнавай, Н. Я. Дабрынінай, С. А. Трубнікава. Філасофска-культуралагічны і працэсуальна-выніковы падыходы ў трактоўцы тэрміна «культура чытання». Фарміраванне культуры чытання як педагагічная праблема. Складовыя элементы культуры чытання і шляхі педагагічнага ўплыву на іх удасканаленне. Сфарміраванасць культуры выбару матэрыялаў да чытання. Педагагічныя задачы на этапе фарміравання культуры выбару. Культура ўспрымання тэкставай інфармацыі і шляхі яе фарміравання ва ўмовах бібліятэкі. Культура засваення і выкарыстання ўспрынятай інфармацыі. Фактар чытацкіх зносін у фарміраванні ўмення карыстацца назапашаным інтэлектуальным і маральным патэнцыялам.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Мерапрыемствы, накіраваныя на фарміраванне культуры чытання і інфармацыйнай культуры карыстальнікаў.

*Тэма 16. Індывідуальнае абслугоўванне карыстальнікаў бібліятэк у сучасных сацыякультурных умовах*

Індывідуальнае абслугоўванне – аснова бібліятэчнага абслугоўвання. Распрацоўка праблем індывідуальнага абслугоўвання ў працах В. М. Бігезы, А. Е. Даўгаполавай, Л. А. Дзямешкі, Н. У. Клімянковай, С. А. Паўлавай і інш. Значэнне работ расійскіх бібліятэказнаўцаў В. А. Азаравай, Г. А. Алтуховай, В. А. Барадзіной, С. А. Езавай, М. Я. Дворкінай для распрацоўкі тэорыі і методыкі індывідуальнага абслугоўвання. Задачы індывідуальнага абслугоўвання.

Псіхолага-педагагічныя аспекты індывідуальнага абслугоўвання. Бібліятэчныя зносіны і іх роля ў індывідуальным абслугоўванні. Тэхналогія індывідуальнага абслугоўвання ў ручным і аўтаматызаваным рэжымах. Формы адраснага распаўсюджвання інфармацыі з дапамогай камп’ютарных тэхналогій. Гутарка і кансультацыя як асноўныя формы індывідуальнай работы з чытачамі. Індывідуальнае абслугоўванне ў навуковых і спецыяльных бібліятэках. Выбіральнае распаўсюджанне інфармацыі. Дыферэнцыраванае абслугоўванне кіраўніцтва. Тэматычнае абслугоўванне кіраўніцтва. Аналітычна-кансультацыйная дзейнасць бібліятэк. Вывучэнне і аналіз вынікаў індывідуальнага абслугоўвання.

*Тэма 17. Масавае і групавое абслугоўванне карыстальнікаў бібліятэк*

Распрацоўка тэарэтыка-метадычных аспектаў масавага абслугоўвання ў работах беларускіх навукоўцаў В. М. Бігезы, А. Е. Даўгаполавай, Л. А. Дзямешкі, Н. У. Клімянковай, С. А. Паўлавай і інш. Работы расійскіх бібліятэказнаўцаў Г. К. Алзоевай, М. Я. Дворкінай, А. В. Кандрашкінай, Ю. П. Мяленцьевай па праблемах масавага абслугоўвання. Вызначэнне тэрмінаў «масавае бібліятэчна-інфармацыйнае абслугоўванне», «групавое і франтальнае абслугоўванне». Сацыяльна-псіхалагічныя асновы масавага абслугоўвання.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Формы нагляднага інфармавання і аўдыявізуальнай рэкламы дакументаў. Кніжныя выставы, іх класіфікацыя. Этапы работы над выставай. Адкрытыя агляды дакументаў, методыка іх арганізацыі. Плакаты. Электронныя выставы.

Традыцыйныя і інавацыйныя формы вуснага інфармавання карыстальнікаў. Іх характарыстыка. Методыка падрыхтоўкі і правядзення. Стварэнне прэзентацыйных матэрыялаў. Аматарскія аб’яднанні чытачоў пры бібліятэках. Комплексныя формы абслугоўвання. Методыка распрацоўкі, этапы падрыхтоўкі і правядзення мерапрыемстваў у межах праектнай дзейнасці бібліятэк. Арганізацыя чытацкіх зносін як перспектыўны кірунак масавай работы бібліятэк. Бібліятэка – цэнтр чытацкіх зносін.

### *Тэма 18. Віртуальнае абслугоўванне ва ўмовах інфарматызацыі грамадства*

Віртуальнае абслугоўванне як сродак забеспячэння шырокага і бесперашкоднага доступу да інфармацыі і культурных каштоўнасцей усіх колаў насельніцтва. Псіхолага-педагагічныя аспекты віртуальнага абслугоўвання карыстальнікаў. Умовы і сродкі дыстанцыйнага абслугоўвання. Супярэчнасці дыстанцыйнага абслугоўвання. Формы і метады дыстанцыйнага абслугоўвання. Сацыяльныя сеткі ў дыстанцыйным абслугоўванні. Дыстанцыйнае абслугоўванне як сродак прыцягнення чытачоў у бібліятэку. Бібліятэка WEB 2.0 і 3D кнігі. Пераўтварэнне бібліятэкі ў партал доступу да сусветных інфармацыйных рэсурсаў сродкамі дыстанцыйнага абслугоўвання.

## Раздзел 5. Асаблівасці бібліятэчнага абслугоўвання дзяцей і юнацтва

### *Тэма 19. Стан і тэндэнцыі развіцця чытання падрастаючага пакалення як прадмет даследавання ў Рэспубліцы Беларусь*

Чытанне падрастаючага пакалення як база ведаў, чытацкіх навыкаў і чытацкіх паводзін дарослага чалавека. Сацыялогія дзіцячага чытання Рэспублікі Беларусь у кантэксце сусветных сацыякультурных працэсаў. Уплыў на яе развіццё буйнейшых

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

даследаванняў чытання дзяцей і падлеткаў сярэдзіны 1960 – канца 1990-х гг. Параўнальнае міжнароднае даследаванне «Што чытаюць дзеці свету» і ўдзел у ім беларускіх сацыёлагаў. Даследаванне «Структура і дынаміка дзіцячага чытання ў Рэспубліцы Беларусь» (1996): асаблівасці правядзення і асноўныя вынікі. Даследаванне «Сучасны стан і тэндэнцыі развіцця дзіцячага чытання ў Рэспубліцы Беларусь» (2009–2010). Метадычныя падыходы да даследавання дзіцячага чытання. Вывучэнне чытання ў кантэксце існуючых сацыякультурных працэсаў.

*Тэма 20. Псіхолага-педагагічныя ўмовы пазітыўнага ўплыву бібліятэкі на дзіцячае чытанне*

Бібліятэчная педагогіка як навука аб выхаванні кнігай. Уклад айчынных бібліятэказнаўцаў В. М. Бігезы, Л. А. Дзямешкі, Н. У. Клімянковай, С. А. Паўлавай у развіццё бібліяпедагагічных канцэпцый падтрымкі і развіцця дзіцячага чытання. Напрацоўкі расійскіх бібліятэказнаўцаў Л. І. Беленькай, Н. Я. Дабрынінай, А. Л. Кабачэк, І. І. Ціхаміравай і інш. у галіне педагогікі і псіхалогіі дзіцячага чытання. Бібліятэка як педагагічная сістэма. Спецыфіка арганізацыйна-педагагічных, псіхолага-педагагічных і дыдактычных умоў развіцця і падтрымкі дзіцячага чытання ў бібліятэцы. Бібліятэчныя зносіны як механізм псіхолага-педагагічнага ўзаемадзеяння бібліятэкара з карыстальнікам. Псіхолага-педагагічнае майстэрства бібліятэкара. Спецыфіка псіхолага-педагагічных працэсаў, што адбываюцца пры абслугоўванні дзяцей і падлеткаў.

*Тэма 21. Улік узроставых асаблівасцей юных карыстальнікаў падчас індывідуальнага абслугоўвання*

Улік узроставых асаблівасцей юных чытачоў пры выбары сродкаў і зместу ўплыву на чытанне. Чытацкія характарыстыкі дашкольнікаў і спецыфіка ўзаемадзеяння з імі. Характарыстыка чытання дзяцей малодшага школьнага ўзросту (6–9 гадоў) і роля бібліятэкі ў іх чытацкім развіцці. Супрацоўніцтва з сям’ёй, школай, сацыяльнымі службамі. Стварэнне асяроддзя, якое прываблівае да чытання. Характарыстыка чытання падлеткаў і асаблівасці псіхолага-педагагічнага ўзаемадзеяння з імі. Чытанне

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

малодшых падлеткаў (10–11 гадоў) і старшых (12–14 гадоў). Улік асаблівасцей культурнага самавызначэння падлетка ў межах маладзёжнай субкультуры. Выкарыстанне «лідараў чытання» для пашырэння і паглыблення бібліятэчнага ўплыву. Стымуляванне творчага самавыражэння падлеткаў падчас арганізацыі масавых мерапрыемстваў. Выкарыстанне духу спаборніцтва пры арганізацыі турніраў, інтэлектуальных гульняў, конкурсаў. Педагагічны патэнцыял сустрэч з людзьмі, якія многага дабіліся ў жыцці дзякуючы кнігам і чытанню. Фарміраванне кола валанцёраў, «сяброў бібліятэкі».

*Тэма 22. Трансфармацыя форм масавага абслугоўвання з улікам сацыяльна-псіхалагічных і ўзроставых асаблівасцей юных карыстальнікаў*

Чытацкае развіццё асобы дзіцяці. Псіхафізіялагічныя асаблівасці дзяцей-дашкольнікаў, малодшых школьнікаў, падлеткаў, юнакоў у кантэксце іх чытацкага развіцця. Уплыў узроставых асаблівасцей на сацыялізацыю асобы. Улік узроставых асаблівасцей пры бібліятэчным абслугоўванні ў ручным і аўтаматызаваным рэжымах. Арганізацыя чытацкіх стасункаў у бібліятэцы. Нагляднае інфармаванне дзяцей, падлеткаў, юнакоў у бібліятэцы. Асаблівасці афармлення выстаў для дзяцей дашкольнага і малодшага школьнага ўзросту.

Масавая работа з дзецьмі і падлеткамі. Інавацыйныя формы. Інтэрактыўныя формы масавай работы. Гульні і спаборніцтвы. Значэнне і роля камп’ютарных гульняў. Арганізацыя пры бібліятэках дзіцячых аматарскіх аб’яднанняў. Кірункі і змест работы. Работа бібліятэк з дзецьмі і падлеткамі ў дапамогу навучальнаму працэсу. Гурткі і школы па ўдасканаленні тэхнікі чытання. Гурткі па вывучэнні замежных моў. Сувязь са школьнымі бібліятэкамі.

*Тэма 23. Узаемадзеянне бібліятэкі з сям’ёй, школай, сацыяльнымі службамі і грамадскімі арганізацыямі ў працэсе абслугоўвання дзяцей і падлеткаў*

Роля сям’і і сямейнага чытання ў чытацкім развіцці асобы. Бібліятэчна-інфармацыйная падтрымка сямейнага чытання. Індыві-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

дуальная работа з бацькамі юных карыстальнікаў бібліятэк. Бібліятэкі сямейнага чытання. Масавыя мерапрыемствы, накіраваныя на падтрымку сямейнага чытання. Дапамога бацькам у кіраўніцтве чытаннем дзяцей. Узаемадзеянне бібліятэкі са школай у працэсе развіцця і падтрымкі чытання юных карыстальнікаў. Дапамога ў засваенні школьнай праграмы. Культурна-дасугавая дзейнасць у кантакце са школай. Фарміраванне культуры чытання і бібліятэчна-бібліяграфічнай пісьменнасці. Супольная работа з праваахоўнымі органамі па фарміраванні прававой культуры і прававой свядомасці. Работа з «цяжкімі» падлеткамі па прадухіленні правапарушэнняў.

Узаемадзеянне з сацыяльнымі службамі ў галіне інфармацыйнага забеспячэння абароны правоў дзіцяці. Узаемадзеянне з грамадскімі арганізацыямі, дабрачыннымі фондамі і супольніцтвамі.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# ІНФАРМАЦЫЙНА-МЕТАДЫЧНАЯ ЧАСТКА

## Літаратура

*Асноўная*

*1.* Аб унясенні змяненняў і дапаўненняў у Закон Рэспублікі Беларусь «Аб бібліятэчнай справе ў Рэспубліцы Беларусь»: Закон Рэсп. Беларусь ад 11 лістап. 2002 г., № 147-З // Нац. реестр правовых актов Респ. Беларусь. – 2002. – № 128, 2/896.

*2. Бородина, В. А.* Библиотечное обслуживание: учеб.-метод. пособие / В. А. Бородина. – М. : Либерея, 2004. – 166 с. – (Серия «Библиотекарь и время»).

*3. Ванеев, А. Н.* Конфликты в библиотеке: предупреждение и разрешение / А. Н. Ванеев. – СПб. : Профессия, 2002. – 128 с. – (Библиотечный практикум).

*4. Галимова, Е. Я.* Библиотечный сервис: учеб.-метод. пособие / Е. Я. Галимова. – М. : Либерея-Бибинформ, 2006. – 142 с.

*5. Дворкина, М. Я.* Библиотечное обслуживание: новая реальность : лекции / М. Я. Дворкина ; Моск. гос. ун-т культуры и искусств. – М. : Изд-во МГУКИ : Профиздат, 2003. – 44 с. – (Серия «Современная библиотека»).

*6. Дзямешка, Л. А.* Абслугоўванне карыстальнікаў бібліятэк: вучэб. дапам. для студ. спецыяльнасці «бібліятэказнаўства і бібліяграфія» / Л. А. Дзямешка, С. А. Паўлава. – Мінск : БДУКМ, 2007. – 114 с.

*7. Клімянкова, Н. У.* Сацыялогія і псіхалогія чытання : вучэб.-метад. дапам. / Н. У. Клімянкова. – Мінск : БДУКМ, 2015. – 212 с.

*8. Кондрашкина, Е. В.* Массовое библиотечное обслуживание: учеб.-практ. пособие / Е. В. Кондрашкина. – М. : Литера, 2012. – 176 с.

*9. Мелентьева, Ю.П.* Библиотечное обслуживание : учебник / Ю. П. Мелентьева. – М. : ФАИР, 2006. – 252 с. – (Специальный издательский проект для библиотек).

*10. Мотульский, Р. С.* Национальная библиотека Беларуси : учеб. пособие для вузов / Р. С. Мотульский ; Нац. б-ка Беларуси, Белорус. гос. ун-т культуры и искусств. – Минск : Нац. б-ка Беларуси, 2009. – С. 57–74.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*11. Олзоева, Г. К.* Массовая работа библиотек: учеб.-метод. пособие / Г. К. Олзоева. – М. : Либерея-Бибинформ, 2006. – 120 с.

*12.* Организация обслуживания пользователей: из опыта работы Национальной библиотеки Беларуси : сб. ст. / Нац. б-ка Беларуси. – Минск, 2009. – 148 с.

*13. Петушко, Н. Е.* Библиотечное обслуживание инвалидов по зрению : науч.-практ. пособие / Н. Е. Петушко. – М. : Литера, 2012. – 240 с.

*14.* Сацыяльна-педагагічныя аспекты дзейнасці бібліятэк Беларусі і іх кадравае забеспячэнне : манагр. – Мінск : БДУКМ, 2012. – 232 с.

*15.* Современное состояние и тенденции развития детского чтения в Республике Беларусь: по результатам республиканского исследования / Нац. б-ка Беларуси. – Минск, 2011. – 156 с.

*16.* Справочник библиотекаря / науч. ред. А. Н. Ванеев, В. А. Минкина. – 3-е изд., перераб. и доп. – СПб. : Профессия, 2006. – С. 168–226.

*17.* СТБ 7.20 – 2000. Бібліятэчная статыстыка: Асноўныя палажэнні. – Мінск, 2000. – 11 с.

*18.* СТБ 7.31 – 2000. Міжбібліятэчны абанемент: Асноўныя палажэнні. – Мінск, 2000. – 6 с.

*Дадатковая*

*19.* Библиотечное обслуживание в информационном веке: ежегодный межведомственный сб. науч. тр. / Федеральное агентство по науке и инновациям, Гос. науч.-техн. б-ка России ; редкол.: Я. Л. Шрайберг [и др.]. – М. : ГПНТБ России, 2009. – 67 с.

*20.* Библиотечное обслуживание детей и юношества: американский опыт: сборник / Рос. гос. б-ка ; пер. с англ. и сост. Р. З. Пановой, В. П. Чудиновой. – М. : Пашков дом, 2004. – 254 с.

*21. Клімянкова, Н. У.* Педагагічная дзейнасць сучасных бібліятэк: тэарэтыка-метадычны аспект / Н. У. Клімянкова // Адукацыя і выхаванне. – 2009. – № 12. – С. 44–50.

*22. Паўлава, С. А.* Стварэнне прэзентацыйных матэрыялаў з дапамогай Power Point: матэрыялы ў дапамогу студэнтам ФІДК і ФЗН / С. А. Паўлава. – Мінск : Беларус. дзярж. ун-т культуры, 2003. – 17 с.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*23. Збаровская, Н. В.* Выставочная деятельность публичных библиотек / Н. В. Збаровская. – СПб. : Профессия, 2004. – 224 с. – (Серия «Библиотека»).

*24. Езова, С. А.* Библиотечное общение: возможные пути моделирования / С. А. Езова // Науч. и техн. б-ки. – 2009. – № 5. – С. 67–74.

*25. Кірухіна, Л. Г.* Самабытная спадчына нацыі: публічная бібліятэка як захавальніца народных традыцый: тэарэтыка-метадычны аспект / Л. Г. Кірухіна ; Нац. б-ка Беларусі. – Мінск, 2005. – 75 с.

*26. Лявончыкаў, В. Е.* Тлумачальны слоўнік бібліятэчных і бібліяграфічных тэрмінаў / В. Е. Лявончыкаў, Л. А. Дзямешка, Р. І. Саматыя. – 3-е выд., выпр. і дап. – Мінск : Беларус. дзярж. ун-т культуры і мастацтваў, 2012. – 232 с.

*27. Мелентьева, Ю. П.* Публичные центры правовой информации: новые возможности библиотечного обслуживания / Ю. П. Мелентьева. – М. : ФАИР-ПРЕСС, 2004. – 96 с. – (Специальный издательский проект для библиотек).

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## Пералік рэкамендаваных сродкаў дыягностыкі

Аб’ектам дыягностыкі вынікаў вучэбнай дзейнасці студэнтаў з’яўляюцца акадэмічныя, сацыяльна-асобасныя і прафесійныя кампетэнцыі, зафіксаваныя ў адукацыйным стандарце Рэспублікі Беларусь па спецыяльнасці 1-23 01 11 Бібліятэказнаўства і бібліяграфія (па напрамках).

Для выніковай дыягностыкі кампетэнцый студэнта па вучэбнай дысцыпліне «Бібліятэчна-інфармацыйнае абслугоўванне. Раздзел 2. Абслугоўванне карыстальнікаў бібліятэк» праводзіцца залік і экзамен. Ацэнка вучэбных дасягненняў студэнта на заліку і экзамене ажыццяўляецца з улікам актыўнасці работы на лекцыйных, семінарскіх, практычных і лабараторных занятках, а таксама з улікам дасягненняў і выканання ім кантралюемай і кіруемай самастойнай работы.

Для ацэнкі дасягненняў студэнтаў па вучэбнай дысцыпліне «Бібліятэчна-інфармацыйнае абслугоўванне. Раздзел 2. Абслугоўванне карыстальнікаў бібліятэк» і дыягностыкі фарміравання кампетэнцый студэнтаў выкарыстоўваецца наступны дыягнастычны інструментарый:

– удзел студэнта і выступленне яго на семінары з падрыхтаваным інфармацыйным (тэматычным) паведамленнем і інш.;

– абарона заданняў, выкананых на практычных і лабараторных занятках;

– падрыхтоўка рэфератаў па асобных тэмах, раздзелах дысцыпліны;

– абарона выкананых у рамках кіруемай самастойнай работы індывідуальных (групавых) заданняў;

– падрыхтоўка тэстаў па асобных тэмах, раздзелах дысцыпліны;

– вусныя бягучыя кантрольныя апытанні па асобных тэмах падчас заняткаў;

– абарона курсавых і дыпломных праектаў (работ);

– залік і экзамен па дысцыпліне;

– дзяржаўны экзамен;

– іншыя сродкі дыягностыкі, якія прадугледжваюць эўрыстычную дзейнасць і нефармалізаваны адказ.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## Метадычныя рэкамендацыі па арганізацыі і выкананні самастойнай работы студэнтаў

У мэтах павышэння эфектыўнасці засваення вучэбнага матэрыялу па вучэбнай дысцыпліне і фарміравання прафесійных кампетэнцый прадугледжана самастойная работа студэнтаў (СРС), якая накіравана на актывізацыю вучэбна-пазнавальнай дзейнасці студэнтаў; фарміраванне навыкаў самастойнага прымянення ведаў на практыцы; самаразвіццё і самаўдасканаленне.

Студэнты вывучаюць рэкамендаваную літаратуру і выконваюць розныя формы СРС па прапанаваных тэмах. Змест работы павінен паказаць ступень засваення студэнтамі асноўных кірункаў абслугоўвання карыстальнікаў бібліятэк, валодання навыкамі і ўменнямі рыхтаваць мерапрыемствы розных форм.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*Вучэбнае выданне*

**БІБЛІЯТЭЧНА-ІНФАРМАЦЫЙНАЕ АБСЛУГОЎВАННЕ**
**Раздзел 2. АБСЛУГОЎВАННЕ КАРЫСТАЛЬНІКАЎ БІБЛІЯТЭК**

*Тыпавая вучэбная праграма*
*па вучэбнай дысцыпліне для спецыяльнасці*
*1-23 01 11 Бібліятэчна-інфармацыйная дзейнасць (па напрамках)*

Карэктар В. Б. Кудласевіч
Тэхнічны рэдактар Л. М. Мельнік

Падпісана ў друк 2017. Фармат 60x84 $^{1}/_{16}$.
Папера офісная. Рызаграфія.
Ум. друк. арк. 1,57. Ул.-выд. арк. 1,03. Тыраж экз. Заказ .

Выдавец і паліграфічнае выкананне:
установа адукацыі
«Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў».
Пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі выдаўца, вытворцы,
распаўсюджвальніка друкаваных выданняў № 1/177 ад 12.02.2014.
ЛП № 02330/456 ад 23.01.2014.
Вул. Рабкораўская, 17, 220007, г. Мінск.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ